ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (2009) ● Чацвер, 4 снежня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**5 СНЕЖНЯ ВЯЛІКАЕ СВЯТА УСЯГО САВЕЦКАГА НАРОДА—ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР**



## МЫ З ТАБОЙ, ЧЫЛІ!

Нядаўна камсамольцы хімічнага факультэта правялі мітынг салідарнасці са свабодалюбівым народам Чылі, прысвечаны адбыўшайся у Афінах 17 лістапада 1975 года канферэнцыі Міжнароднай салідарнасці з народам Чылі.

Усім вядома, што чылійская хунта вось ужо на працягу двух гадоў не спыняе кампанію тэрору і рэпрэсій супраць патрыётаў і дэмакратаў Чылі. Насуперак усеагульнай дэкларацыі праў чалавека, шматлікім заклікам ААН і усяго прагрэсіўнага чалавецтва у Чылі працягваецца грубае парушэнне дэмакратычных правоў і свабод.

Па усім свеце з новай сілай гучыць заклік да актывізацыі сумесных дзеянняў старонікаў дэмакратыі у Чылі. Асуджаючы катаў чылійскага народа, сусветная грамадскасць заяўляе аб сваёй глыбокай упэўненасці у перамозе справядлівай барацьбы чылійскіх дэмакратаў, свабодалюбівага і мужнага чылійскага народа.

На сваім мітынгу салідарнасці з народам Чылі выкладчыкі і студэнты хімфака аднадушна прынялі зварот да студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна.

У звароце, у прыватнасці, адзначана: «Мы горача адабраем і падтрымліваем дакументы канферэнцыі: заклік да народаў свету, зварот да чылійскага народа, праграму далейшых дзеянняў руху салідарнасці з чылійскімі дэмакратамі.

Наш мітынг з'яўляецца часткай міжнароднага руху салідарнасці з антыфашысцкай барацьбой чылійскага народа.

Мы гнеўна і рашуча асуджаем крывавыя злачынствы фашысцкай хунты у Чылі і заклікаем студэнтаў універсітэта падтрымаць наш зварот, уступіць у барацьбу за агульную справу прагрэсу і справядлівасці.

Рух салідарнасці з народам Чылі — гэта барацьба не толькі супраць чылійскага фашызму. Гэта барацьба супраць фашызму наогул!

Справядлівая справа чылійскіх дэмакратаў пераможа!

Свабоду Луісу Карвалану і усім палітычным зняволеным!

Спыніць руку катаў!»

**Т. ВОЛКАВА.**

## ВУЧЫСЯ ЎМЕЛА КІРАВАЦЬ

Два дні правялі камсамольскія актывісты універсітэта на турбазе Беларускай ваеннай акругі у Ждановічах. Тут праходзіла арганізаваная камітэтам камсамола БДУ вучоба камсамольскага актыву.

Праграма вучобы была насычанай і разнастайнай. З пытаннем аб правільным вядзенні камсамольскіх дакументаў выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па арганізацыйнай рабоце В. Гаро. Намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце В. Андруховіч падрабязна расказаў аб грамадска-палітычнай дзейнасці студэнтаў, аб тым значэнні, якое яна мае для набыцця навыкаў арганізацыйнай і грамадска-палітычнай работы у калектыве.

Абмен камсамольскіх дакументаў — актуальнае пытанне камсамоліі нашага універсітэта. Таму на вучобе яму удзялялася вялікая увага.

Намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па навуковай рабоце У. Пузікаў пазнаёміў камсамольцаў з работай грамадскіх кафедр універсітэта.

Камсамольскія актывісты дзяліліся вопытам работы, уносілі цікавыя прапановы, абмяркоўвалі хвалюючыя пытанні.

Але камсамольцы займаліся не толькі вучобай. Быў праведзены рад культурных мерапрыемстваў. З цікавым расказам аб ідэалагічнай дыверсіі капіталістычных краін супраць СССР выступіў выкладчык кафедры гісторыі журналістыкі, кандыдат гістарычных навук А. Г. Слука.

Словы з выступлення сакратара камітэта камсамола БДУ А. А. Тозіка «той кіраўнік добры, які не сам працуе, а усё трымае у сваім полі зроку, умела кіруе» можна лічыць дэвізам праведзенай вучобы камсамольскага актыву.

**А. КАМЕНКА,**
**студэнтка III курса журфака.**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

### БІЯФАК

На біялагічным факультэце была створана група, якая з 27 жніўня па 16 лістапада праходзіла вытворчую практыку у ГДР.

У адпаведнасці з праграмай азнаямлення з Гальскім універсітэтам студэнты наведалі аддзел генетыкі, дзе даведаліся аб асноўных напрамках даследаванняў. З іншымі аддзеламі іх пазнаёмілі прафесар універсітэта Шуберт і доктар Себел.

Асноўнымі прадметамі даследавання былі экалогія, марфалогія раслін, вывучэнне уплыву навакольнага асяроддзя на рытм росту і абнаўлення РНК, уплыву забруджання атмасферы на развіццё грыбоў-паразітаў.

Студэнты наведалі старэйшы Батанічны сад (277 гадоў, плошча 4,5 га), дзе расце 10 тысяч відаў раслін, азнаёміліся з трапічнай флорай, багатай калекцыяй кактусаў, архідэй, сукулентаў.

Другая група студэнтаў 4 курса, якія спецыялізуюцца па кафедрах біяхіміі і мікрабіялогіі, праходзіла частку летняй практыкі на біяфаку Сафійскага універсітэта. Яны даведаліся аб цікавых даследаваннях, якія праводзяцца у галіне мікрабіялогіі. Біёлагі вывучалі метады узбагачэння руд з дапамогай мікраарганізмаў, працавалі над праблемамі выяўлення антыгрыбковых і антывірусных антыбіётыкаў, а таксама азнаёміліся з навуковымі праблемамі, якія вывучаюць балгарскія вучоныя.

**С. ШУЛЬМАН,**
**студэнтка II курса журфака.**

* * *

«Паляванне і вядзенне паляўнічай гаспадаркі у Чэхаславакіі» — на гэту тэму перад студэнтамі біялагічнага факультэта выступіў выкладчык тэхналагічнага інстытута Л. М. Маліноўскі на чарговым пасяджэнні навуковых гурткоў кафедры заалогіі і агульнай экалогіі. Ён падзяліўся сваімі уражаннямі ад паездкі у ЧССР, расказаў пра звычаі, рытуалы, традыцыі, пра адносіны людзей гэтай краіны да прыроды.

**С. ФУРСА,**
**студэнтка II курса журфака.**

### ГІСТФАК

У канцы гэтага месяца адбудзецца урачысты вечар «Апошні званок» і «Пасвячэнне у студэнты», да якога ужо старанна рыхтуюцца гісторыкі. Для студэнтаў V курса празвініць апошні званок. Выпускнікі перададуць сваю эстафету першаму курсу, павіншуюць рабят з цудоўнай падзеяй у іх жыцці — паступленнем ва універсітэт.

* * *

Цікавай і шчырай атрымалася сустрэча гістфака са студэнтамі замежных краін, якія былі запрошаны у БДУ. Госці расказалі аб сваіх краінах, падзяліліся уражаннямі аб нашай Беларусі, выказалі шчырую радасць у сувязі з тым, што ім выпала вялікае шчасце — вучыцца у Савецкім Саюзе.

* * *

29 лістапада студэнты гістфака далі у школе № 52 горада Мінска канцэрт. І артысты і школьнікі засталіся вельмі задаволенымі.

**С. ВАРАБ'ЁВА,**
**студэнтка I курса журфака.**

## ЗВАРОТ

### НАВУКОВЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ, КАМСАМОЛЬЦАЎ КАФЕДР ВМЗ І АРГАНІЧНАЙ ХІМІІ ДА ЎСІХ НАВУКОВЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ, КАМСАМОЛЬЦАЎ БДУ

**ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!**

Мы жывём і працуем у знамянальны час — час навуковых адкрыццяў і працоўных здзяйсненняў, калі увесь савецкі народ рыхтуецца дастойна сустрэць XXV з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Побач з нашымі старэйшымі таварышамі мы, камсамольцы, навуковыя супрацоўнікі кафедр, аддаём усе свае сілы, веды і навыкі агульнай справе навукова-тэхнічнага прагрэсу, упорнай працай садзейнічаем выкананню планаў навуковай работы кафедр. Разам з тым мы лічым сваім абавязкам удзельнічаць у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, звязваючы задачу павышэння іх прафесіянальнага узроўню з задачай камуністычнага выхавання.

1975 год знамянальны для нас тым, што камсамольцамі нашай групы абаронены 4 кандыдацкія дысертацыі, падрыхтаваны і здадзены у друк 22 навуковыя работы, зроблена 10 дакладаў на канферэнцыях.

Мы заклікаем усіх камсамольцаў, навуковых супрацоўнікаў БДУ уключыцца у спаборніцтва за права падпісаць Рапарт XXV з'езду роднай Камуністычнай партыі.

**Мы, камсамольцы, навуковыя супрацоўнікі кафедр ВМЗ і арганічнай хіміі, абавязваемся:**

— сустрэць XXV з'езд КПСС новымі дасягненнямі у працы, падрыхтаваць да друку 12 навуковых работ, падаць 6 заявак на вынаходніцтвы, падрыхтаваць 6 выступленняў на канферэнцыях, прыняць удзел у напісанні 3 навукова-тэхнічных справаздач;

— прыцягнуць да навуковай работы 10 студэнтаў і весці пастаянную работу па павышэнню іх прафесіянальнага узроўню і па камуністычнаму выхаванню;

— прачытаць на вячэрніх грамадскіх падрыхтоўчых курсах пры камітэце камсамола універсітэта 10 лекцый па хіміі;

— прачытаць для насельніцтва 6 лекцый.

Дастойна сустрэнем XXV з'езд КПСС!

# ВІНШУЕМ!

**18 лістапада—60 год з дня нараджэння і 40 год працоўнай і грамадскай дзейнасці кандыдата геаграфічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры геадэзіі і картаграфіі геаграфічнага факультэта БДУ Віктара Якаўлевіча Крышчановіча.**

**У Белдзяржуніверсітэце В. Я. Крышчановіч працуе з 1940 года. У гэтым жа годзе ён быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны В. Я. Крышчановіч вярнуўся на выкладчыцкую работу ва універсітэт.**

**За час работы ва універсітэце В. Я. Крышчановіч праявіў сябе як выдатны педагог, які аддае шмат сіл і энергіі навучанню і выхаванню студэнцтва. Лекцыі па тапаграфіі з асновамі геадэзіі, картаграфіі і эканомкартаграфіі чытаюцца ім на высокім навукова-педагагічным узроўні.**

**Географы ведаюць В. Я. Крышчановіча як віднага картографа, складальніка і рэдактара многіх карт, якія маюць вялікае навуковае і практычнае значэнне. Ім напісана звыш 20 вучэбна-метадычных дапаможнікаў па геадэзіі, картаграфіі, эканамічнаму карціраванню і картаграфічнаму чарчэнню. Як загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі В. Я. Крышчановіч шмат зрабіў для пашырэння матэрыяльнай базы кафедры. Ён паспяхова вядзе навукова-даследчую работу па карціраванню насельніцтва, складанню карт.**

**В. Я. Крышчановіч з'яўляецца актыўным прапагандыстам геаграфічных ведаў у рэспубліцы, чытае лекцыі для насельніцтва нашай рэспублікі і за яе межамі. Ён актыўна ўдзельнічае ў рабоце секцыі геаграфіі навукова-тэхнічнага савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, з'яўляецца яе навуковым сакратаром, членам рэдакцыйнага савета Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Мае ўрадавыя ўзнагароды, граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, таварыства «Веды» і інш.**

**Ад усёй душы віншуем юбіляра, жадаем яму добрага здароўя, далейшых поспехаў у навукова-педагагічнай і грамадскай рабоце.**

*Студэнты і супрацоўнікі геаграфічнага факультэта.*

# КАЛІ Ў КАЛЕКТЫВЕ ДРУЖАЦЬ

Давайце паразважаем аб студэнце. Паступаюць у ВНУ ў асноўным роўныя па ведах, зацікаўленыя людзі. Усе яны жадаюць вучыцца. Але чаму потым атрымліваюцца, з аднаго боку, «шэранькія» студэнты, якія ледзь-ледзь пералазяць з курса на курс, і другія, тыя, каму ўсё цікава, хто з радасцю выконвае грамадскія даручэнні, спяшаецца на пасяджэнне СНТ?

Ішоў чарговы семінар па крымінальнаму праву ў 3 групе III курса юрыдычнага факультэта. Задача выклікала многа спрэчак, думак, самых процілеглых поглядаў. Раўнадушных не было. Кожны хацеў выказаць свой пункт гледжання, унесці сваю прапанову. Выкладчык В. Л. Пруднічэнка з канчатковым рашэннем не спяшалася, цярпліва чакала, давала магчымасць выказаць сваю думку. Нарэшце, рашэнне было знойдзена.

Пасля семінара адбылася размова з рабятамі.

3 група III курса лічыцца адной з лепшых на факультэце і ў аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу, які праводзіўся ў мінулым навучальным годзе ва універсітэце, заняла першае месца. Гэта параўнальна невялікі (31 чалавек), вельмі згуртаваны, дружны калектыў, а дружба, на думку саміх рабят, абавязвае да многага. Сорамна перад сябрамі не падрыхтавацца да заняткаў, дрэнна адказаць на семінары. Ды і вучыцца хочацца па-сапраўднаму, калі побач з табой цікавыя, захопленыя, дарагія табе людзі. А зрабілі сябрамі рабят першая «бульба», заняткі, наведванні тэатраў усёй групай, леташняя паездка ў Куйбышаў і многія іншыя калектыўныя справы, якія нараджаюць агульныя інтарэсы.

Гаворыць прафорг групы Мікалай Шэлег:

— У нас няма абыякавых, раўнадушных да справу групы людзей. Калі адзін унясе прапанову, усе падтрымаюць. Рабяты разумеюць слова «трэба». Ніхто ніколі не адмовіцца ад даручанай справы, тут жа згодзіцца і абавязкова яе выканае. Кожны сам хоча, каб група была згуртаванай, каб усім было цікава. Няма ў нас «шэранькіх».

Маргарыта Глыжа — камсорг групы:

— Калі гаварыць, што прымушае нас вучыцца, якія стымулы, то ў першую чаргу гэта зацікаўленасць, жаданне ведаць як мага больш. А ужо потым, як вынік тваёй напружанай працы — стыпендыя. І, канешне, у многім дапамагае, як кажуць, пачуццё локця.

Бачым, вучацца тут зацікаўленыя людзі, якія з адказнасцю ставяцца да кожнай справы. І ў грамадскай дзейнасці яны прымаюць удзел, і аб навуковай рабоце не забываюць.

Сярод студэнтаў групы Аляксандр Грынкевіч, сакратар камітэта камсамола факультэта, выдатнік вучобы, Яўгенія Насевіч, сакратар камсамольскага бюро трэцяга курса. Кожны студэнт — член СНТ, акрамя таго, многія актыўна працуюць у ДНД, у дзіцячых пакоях міліцыі або з'яўляюцца грамадскімі памочнікамі следчага, пракурора.

Вядома, усё гэта патрабуе шмат часу. Трэба ўмець разумна планаваць свой працоўны дзень, што не робяць некаторыя студэнты. Але перш за ўсё трэба захацець, вельмі захацець. Як гаворыць народная мудрасць: «Было б хаценне, прыйдзе і ўменне». Трэба захацець жыць інтарэсамі групы, жыць весела і цікава. І тады, няхай не адразу, але здзейсніцца задуманае. Кожны чалавек павінен умець кіраваць сваімі дзеяннямі, учынкамі.

Магчыма, скажуць, не ўсякую справу хочацца зрабіць. Так, часам бывае цяжка захацець, але ёсць яшчэ адно цудоўнае слова — «трэба». І гэта чалавек павінен зрабіць пры дапамозе сваёй сілы волі.

**Т. ПАПОВА,**
**студэнтка**
**II курса журфака.**

# СВЯТА ДРУЖБЫ МОЦНАЙ

На хімічным факультэце БДУ ў гэтым годзе дзейнічала пяць студэнцкіх будаўнічых атрадаў: «Купалінка», «Брыганціна», «Спадчына», «Тытан-75» і «Атлант». У агульнай колькасці ў іх налічвалася 175 байцоў. На днях на факультэце адбыўся вечар, прысвечаны падвядзенню вынікаў трэцяга, працоўнага семестра 1975 года.

— Ганаровай граматай за доблесную працу ўзнагароджваецца баец студэнцкага будаўнічага атрада...

Да століка, засланага чырвоным сукном, адзін за адным падыходзяць студэнты-хімікі, удзельнікі СБА, з хваляваннем прымаюць з рук сакратара камітэта камсамола факультэта Аляксандра Скарапанава заслужаныя ўзнагароды. А за імі, гэтымі ўзнагародамі, — месяцы напружанай працы ў Казахстане і на Смаленшчыне, у Беларусі і Малдавіі. Але успаміны аб працы непарыўна звязваюцца з палыханнем начных кастроў, са знаёмым гучаннем гітары, з вясёлымі студэнцкімі песнямі. А тая дружба, якая застаецца на доўгія гады, вера ў сябе, упэўненасць у сваіх сілах!

...Пётр Нікалайцаў, камандзір будаўнічага атрада «Спадчына», прызнанага лепшым сярод СБА факультэта, чытаў гэты доўгі спіс, дзе сярод іншых прозвішчаў былі і прозвішчы яго рабят, з прыемным хваляваннем.

А потым быў конкурс агітбрыгад. Шмат канцэртаў далі юнакі і дзяўчаты на месцах дыслакацыі. І вось цяпер прывезлі з сабой песні і танцы, мініяцюры, якія найбольш палюбіліся. Доўга не хацелі адпускаць гледачы агітбрыгаду СБА «Атлант», чыё выступленне было адным з лепшых.

У вестыбюлі трэцяга этажа хімфака, дзе былі вывешаны насценгазеты, было мнагалюдна. Цікава даведацца з газет аб жыцці, працы і адпачынку байцоў атрадаў.

Да позняга часу не змаўкалі жывыя гутаркі, песні. Вечар СБА выліўся ў свята цёплых успамінаў, свята моцнай студэнцкай дружбы.

**Я. ЯСЭПКІН,**
**студэнт II курса журфака.**



# ТОЛЬКІ «ВЫДАТНА»!

Працяглы званок абвясціў аб заканчэнні заняткаў. Шумны паток студэнтаў выліваўся ў калідор, напаўняючы яго вясёлай гаворкай, смехам. Я стараюся знайсці твар, знаёмы мне толькі па фотаздымку. Нарэшце ўбачыла сур'ёзную дзяўчыну з прыгожымі вялікімі вачыма. Гэта і была Вера Пешкава. Мы пазнаёміліся.

У школе любімымі прадметамі Веры былі матэматыка і фізіка. Быццам у казачную краіну лічбаў і формул пападала дзяўчына, калі садзілася рыхтаваць урокі. Часам задача або прыклад доўга не атрымліваліся. Тады яна настойліва шукала варыянт рашэння і кожны раз радавалася, знайшоўшы яго. Як звычайна гэта бывае, з любімым заняткам кожны марыць звязаць сваю будучую прафесію. Вера марыла стаць фізікам. І ёй, як кажуць, пашанцавала — пасля заканчэння школы стала студэнткай фізічнага факультэта.

— Звычайна першы блін заўсёды комам, аднак для мяне вучоба на першым курсе не ўяўляла цяжкасцей. Відаць, вялікую ролю ў гэтым адыграла тое, што вучылася я ў школе з матэматычным ухілам, — гаворыць Вера. — Вядома, прыходзілася яшчэ і шмат працаваць.

Ніхто не памятае выпадку, каб дзяўчына не была падрыхтавана да заняткаў. Адказы яе заўсёды поўныя, абгрунтаваныя. Таму і ў заліковай кніжцы толькі выдатныя адзнакі.

— Шмат часу нам прадастаўляецца для самастойных заняткаў,—працягвае Вера.—А гэта галоўнае. Вось я, напрыклад, і некаторыя з маіх сяброў займаемся ў лабараторыі люмінесцэнцыі ў інстытуце прыкладных фізічных праблем, што дапамагае значна павысіць веды.

Камсамолка актыўна ўдзельнічае і ў грамадскім жыцці курса. Другі год яна з'яўляецца намеснікам сакратара па арганізацыйнай рабоце першага патока. Вось і нядаўна, калі было вырашана правесці конкурс палітплаката, Вера адразу прыняла ўдзел у арганізацыі мерапрыемства. Яна лічыць, што быць у гушчыні жыцця групы і патока ў нейкай меры дапамагае ў вучобе.

**Т. ГРЫНЦЭВІЧ.**

# НАША ВЯЛІКАЕ СВЯТА

Белыя кветкі... Строгія і гордыя, яны стаяць на чырвані сукна, яшчэ больш падкрэсліваючы важнасць і святочнасць вечара. Сёння БДУ імя У. І. Леніна адзначае юбілей — 50 год з дня першага выпуску спецыялістаў для роднай краіны.

Зала паступова напаўняецца. На першых радах сядзяць яны, выпускнікі далёкага 1925 года — «віноўнікі» сённяшняй урачыстасці.

Усе прысутныя усталі, дружна заапладзіравалі, калі ў прэзідыум падняліся рэктар універсітэта У. М. Сікорскі і былыя выпускнікі. Маладое пакаленне студэнтаў вітала ветэранаў.

З уступным словам выступіў таварыш У. М. Сікорскі. Ён расказаў аб сучасным універсітэце, аб яго навуковых і працоўных перамогах. 14.000 студэнтаў закончылі дзяржаўны універсітэт за гэтыя паўстагоддзя.

У 1921 было усяго тры факультэты. Зараз універсітэт рыхтуе спецыялістаў самых разнастайных прафесій. Рэктар павіншаваў юбіляраў, што прайшлі нялёгкі працоўны шлях, апраўдалі высокае званне студэнта нашай установы.

Выступае дацэнт універсітэта А. І. Кажушкоў. Ён расказвае, як стварыўся універсітэт. Разруха, голад, класавая барацьба, цяжкае міжнароднае становішча — вось што характарызавала той суровы час. Але маладая Савецкая рэспубліка, нягледзячы на цяжкія фінансавыя абставіны, выдзеліла 106 млн. рублёў для арганізацыі першага беларускага універсітэта. І вось 30 кастрычніка 1921 года адбыліся першыя заняткі.

Ад імя ветэранаў выступіў У. І. Мятлін, лектар таварыства «Веды». У яго голасе адчувалася радасць за сённяшні дзень студэнцтва нашай краіны. І так цяжка было успамінаць аб тым, як вучыліся яны, студэнты 21-га. Доўгія драўляныя лаўкі, некалькі сталоў—вось і ўсё абсталяванне аудыторыі. Не хапала падручнікаў, сшыткаў, а холад у памяшканні быў такі, што нават замярзала чарніла. Але жаданне вучыцца перамагло ўсе перашкоды.

«...Нас з 236 выпускнікоў 25-га года засталося усяго 32 чалавекі. Але мы рады, што можам перадаць эстафету ведаў нашаму маладому студэнцтву. Жадаю вам ад усіх нас поспехаў у вучобе на карысць нашай Радзімы».

З прывітаннем ад усіх студэнтаў БДУ выступіла студэнтка гістарычнага факультэта Вольга Каламінская. Сваё выступленне Вольга закончыла словамі: «Справу, якая пачата вамі, з поспехам прадаўжаем мы!».

Затым рэктар БДУ У. М. Сікорскі уручыў першым выпускнікам Ганаровыя граматы.

Урачысты вечар выліўся ў сапраўднае свята. Студэнты паднеслі ў падарунак ветэранам свой канцэрт мастацкай самадзейнасці, яркі, цікавы, разнастайны.

На сцэне — харавая капэла універсітэта. Яна пачынае канцэрт песняй І. Лучанка «Аб Леніне». Э. Драбышэўская прачытала горкаўскую «Нунчу». Выразным было выступленне ансамбля народных інструментаў і яго салістаў В. Маліноўскай, В. Цімашэвіча, Д. Кашынскай. Але, бадай, самым захапляючым было выступленне народнага ансамбля танца «Крыжачок».

Канцэрт закончыўся цёплымі віншавальнымі словамі ў адрас ветэранаў, усіх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**А. ТУР,**
**студэнтка II курса журфака.**

* * *

**З цікавасцю займаюцца студэнты юрыдычнага факультэта ў гуртку судовай псіхалогіі. Заняткі гуртка праводзяць высокакваліфікаваныя выкладчыкі.**

**НА ЗДЫМКУ: старшы выкладчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта Г. Г. ШЫХАНЦОЎ адказвае на пытанні студэнтаў.**

Фота Т. Петрашкевіч.

* * *





# ЖАДАЮЧЫЯ ТВОРЧАСЦІ

Вясной 1976 года студэнцкі тэатр БДУ будзе святкаваць свой першы юбілей. Нам спауняецца 10 год. За гэты невялікі час тэатр прарабіу вялікую работу: было пастаулена 10 спектакляу, літаратурных кампазіцый, паэтычных праграм.

Студэнцкі тэатр вельмі зорка углядаецца у жыццё, адказвае сваімі спектаклямі на пытанні, якія хвалююць маладых. Так, напрыклад, з вялікім поспехам прайшлі на студэнцкай сцэне п'есы Жукавіцкага «Адны, без анёлау», «Восьмы колер вясёлкі» Альшанскага, «Дальняя дарога» Арбузава.

Тэатр праводзіць вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Аб гэтым сведчаць такія яго пастаноукі, як «Казка аб праудзе» М. Алігер (спектакль аб Зоі Касмадзям'янскай), «Улюбёныя» Т. Ян, «Маладая гвардыя» А. Фадзеева і спектакль па п'есе класіка чэшскай літаратуры К. Чапека «Маці».

Тэатр неаднаразова з'яуляуся прызёрам гарадскіх і абласных конкурсау тэатральнага мастацтва. За спектакль «Улюбёныя» па п'есе Т. Ян, высокае выканаучае майстэрства, шматгадовую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі тэатр узнагароджаны Ганаровай граматай ЦК ЛКСМ Беларусі. Гэта пастаноука высока ацэнена і удзельнікамі савецка-польскага семінара маладзёжных студэнцкіх арганізацый.

У тэатры займаюцца студэнты з розных факультэтау, прыходзяць да нас і тыя, хто дауно ужо скончыу універсітэт, прыходзяць да сяброу, прыходзяць да нязменнага нашага кіраунікa, рэжысёра, арганізатара тэатра, самага вялікага нашага сябра Аляксандра Міхайлавіча Озерава — заслужанага артыста Латвійскай ССР.

Прыходзьце і вы, жадаючыя творчасці, прыходзьце, і вы знойдзеце сяброу. Перад вамі адкрыюцца дзверы у свет цудоунага мастацтва тэатра.

**А. КАСЦЕЦКІ,**
**мастацкі кіраунік самадзейнасці БДУ, дырэктар студэнцкага тэатра.**

# РАЗУМЕННЕ МУЗЫКІ

Вялікую дапамогу у фарміраванні эстэтычных поглядау студэнтау аказвае універсітэцкі народны аркестр народных інструментау. Яшчэ у 1947 годзе з аматарау інструментальнай музыкі быу створаны гурток народных інструментау, які пасля вырас у аркестр. З 1954 года ён прымау удзел ва усіх аглядах, фестывалях і дэкадах народнага мастацтва і заусёды узнагароджвауся дыпломамі першай ступені, ганаровымі граматамі. Пачынаючы з 1956 года аркестр прымае удзел ва усіх студэнцкіх святах у Тарту, Рызе, Вільнюсе. Пасля трэцяй дэкады беларускага мастацтва у 1964 годзе аркестру прысвоена званне «народны». У 1967 годзе калектыу узнагароджаны дыпломам II ступені усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, яму прысвоена ганаровае званне лаурэата усесаюзнага фестывалю.

Аркестр выступае з самадзейнымі канцэртамі не толькі у рэспубліцы, але і за яе межамі—у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Адэсе, Калінінградзе і іншых гарадах.

Нядауна аркестр з вялікім поспехам выступау перад студэнтамі Адэскага універсітэта, а зараз рыхтуецца да адказнай паездкі у Польшчу. Члены аркестра—студэнты БДУ, многія з іх выдатнікі вучобы, актыуна удзельнічаюць у грамадскай рабоце.

**М. ЛІСІЦЫН,**
**мастацкі кіраунік народнага аркестра народных інструментау—заслужаны работнік культуры БССР.**

# ПЕРАМОГА ФПМ

Некалькі дзён назад адбыуся спартыуны вечар, прысвечаны падвядзенню вынікау XXIII агульнауніверсітэцкай спартакіяды і агляду-конкурсу па спартыуна-масавай рабоце за 1974—1975 навучальны год.

Былы старшыня спартыунага бюро факультэта прыкладной матэматыкі Пётр Герасімовіч і яго пераемнік Генадзь Новік атрымалі на гэтым вечары пераходны чырвоны сцяг, граматы і кубкі, якімі узнагароджвауся факультэт за выдатную спартыуна-масавую работу.

Чацвёрты раз запар выйграе факультэт у аглядзе-конкурсе, роуна і пасляхова праходзіць усю праграму спартакіяды. Традыцыйна моцна выступаюць спартсмены ФПМ у жаночым валейболе, класічнай барацьбе, шашках, у мастацкай гімнастыцы. 16 майстроу спорту СССР, 48 кандыдатау у майстры і першаразраднікау — ёсць чым ганарыцца.

Спартыунае бюро арганізуе унутрыфакультэцкія спаборніцтвы, гутаркі, вечары. Знайшлі шырокую падтрымку і папулярнасць на факультэце дні ГПА, якія ператварыліся у сапраудныя спартыуныя святы. У такія дні усе студэнты і выкладчыкі выходзяць на старты комплексу ГПА. Адбываецца урачыстае узнагароджанне пераможцау, гучыць музыка. Дні ГПА — навінка факультэта прыкладной матэматыкі, якую добра было б падхапіць і іншым факультэтам.

Вялікая спартыуная дружба звязвае ФПМ з факультэтам кібернетыкі Кіеускага універсітэта. Два разы у год у Кіеве і Мінску сустракаюцца студэнты гэтых факультэтау на святочных фестывалях спартыунай дружбы.

На ФПМ спорт паважаюць, знаюць яму цану. Кожны спартсмен адчувае адказнасць за выступленне каманды і у самых цяжкіх выпадках праяуляе мужнасць, сілу волі. А вось і прыклад. З траумаванай нагой выступала на агульнауніверсітэцкай спартакіядзе мацнейшая гандбалістка ФПМ Алена Дзюжава. І зрабіла усё, што магла, дзеля перамогі.

**З. РУСАКОВІЧ.**

# ДАЛУЧЭННЕ ДА ПРЫГОЖАГА

Вопыт паказвае, што непасрэднае далучэнне да творчасці станоуча уздзейнічае на ідэйны і маральны воблік маладога чалавека. Не мае значэння, станеш ты фізікам ці юрыстам. Важна, закончыушы універсітэт, унесці, акрамя дыплома, вызначаючага тваю вытворчую спецыяльнасць, ненасытную прагу да цудоунага. І хай гэта будзе не мімалётнае «хобі», якое прарастае на глебе бяздзейнасці, а вялікая любоу, любоу на усё жыццё. Калі ты нават не станеш пець, іграць на сцэне, музыцыраваць, ты будзеш актыуным гледачом, слухачом, чытачом, які можа запаліцца ясным агнём натхнення.

Адной з форм эстэтычнага выхавання моладзі стала студэнцкая мастацкая самадзейнасць. У гэтай сувязі асаблівае месца займае работа народнага ансамбля «Крыжачок» (кіраунік заслужаны дзеяч культуры М. В. Лапша). Гэты калектыу з'яуляецца удзельнікам усіх дэкад, фестываляу і аглядау самадзейнага мастацтва БССР, на якіх неаднаразова узнагароджвауся дыпломамі I, II, III ступеней і Ганаровымі граматамі. Ансамбль «Крыжачок» прадстауляу беларускае танцавальнае мастацтва у розных рэспубліках нашай шматнацыянальнай Радзімы, на ударных камсамольскіх будоулях, на цалінных землях, перад маракамі Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту, у гарадах Маскве, Рызе, Ленінградзе, Тарту, Кіеве, Казані, Харкаве, Кішынёве, Львове, а таксама у некаторых краінах народнай дэмакратыі (ГДР, Польшчы, Балгарыі). Ансамбль «Крыжачок» выступау у 1975 годзе перад удзельнікамі Міжнароднага сімпозіума універсітэтау. Рэпертуар гэтага калектыву пастаянна папауняецца цікавымі харэаграфічнымі пастаноукамі. У ансамбль уваходзяць студэнты усіх факультэтау. Яны пасняхова вучацца, займаюцца навуковай работай, прымаюць актыуны удзел у грамадскім жыцці універсітэта. Усіх іх аб'ядноувае любоу да мастацтва танца, пачуццё высокай адказнасці, сур'ёзныя адносіны да рэпетыцый.

Мы спадзяёмся, што у гэтым годзе ансамбль «Крыжачок» папоуніцца таленавітымі танцорамі студэнтамі - першакурснікамі.

**С. ЛЫСЕНКА,**
**дацэнт.**







**НА ЗДЫМКАХ:** апошнія парады перад выхадам на сцэну дае кіраунік ансамбля М. Лапша; у віхоры танца; ансамбль рыхтуецца да выступлення па тэлебачанню.

# БУДУЦЬ НОВЫЯ ПАХОДЫ

Пра новы зорны паход, прысвечаны XXV з'езду партыі, і пра паходы, якія павінны адбыцца зімой, гаварылі удзельнікі клуба турыстау-альпіністау БДУ на пасяджэнні, якое адбылося на мінулым тыдні. В. Варачаева, удзельніца многіх турысцкіх паходау, дала нямала сапрауды неабходных і патрэбных парад.

На пасяджэнні было чым пахваліцца камандзе універсітэта па альпінізму, якая на першынстве па спартыунаму скалалазанню сярод каманд Гомеля, Брэста, мінскіх ВНУ — БПІ, МРТІ і БДУ заняла першае месца. Ёсць у нашых скалалазау надзея: выступіць на рэспубліканскіх спаборніцтвах таварыства «Буравеснік».

Потым са сваімі разважаннямі і думкамі выступілі кіраунікі зорнага паходу. Некалькі груп турыстау ідуць па месцах баявой партызанскай славы, а потым сустракаюцца, і адбываецца злёт. На гэты раз месцам сустрэчы быу выбраны бераг возера Кромань у Налібоцкай пушчы. Кіраунікамі С. Прышчэпай, В. Луцкім, В. Мароз і іншымі былі выказаны цікавыя парады тым, хто упершыню ішоу у паход.

З цікавасцю удзельнікі клуба слухалі расказ В. Міраненкі пра байдарачны паход па паудгёваму Бугу, расказ І. Соскіна аб лыжным паходзе на Кольскі паувостраў. Упершыню такі паход адбыуся у лістападзе, і яго удзельнікам прыйшлося больш ісці пешшу, чым на лыжах. Але нішто нельга параунаць з сапраудным цудам — веліччу і прыгажосцю пауночнага ззяння.

На пасяджэнні было выбрана бюро, якое павінна займацца усімі справамі клуба. У канцы удзельнікі байдарачнага паходу паказалі слайды, якія зрабілі, падарожнічаючы па паудгёваму Бугу.

**В. ІОСЬКА.**

# ДЗВЕ ГАДЗІНЫ ПРА КІНО

Кінамастацтва любяць і паважаюць усе. Гэтая зусім яшчэ маладая галіна чалавечай творчасці заваявала сэрцы мільёнау людзей. Асабліва захапляецца кіно моладзь. Яна знаходзіць у ім адлюстраванне сваіх пошукау, імкненняу, жаданняу. Студэнты стараюцца не прапусціць ніводнай сустрэчы з людзьмі, якія у большай ці меншай ступені звязаны з кінамастацтвам.

Веды па гісторыі кіно, савецкага і зарубежнага, вельмі патрэбны студэнтам факультэта журналістыкі. Будучым спецыялістам прыйдзецца пісаць рэцэнзіі на фільмы, партрэтныя замалёукі акцёрау, рэжысёрау, аператарау. На журфаку курс гісторыі савецкага кіно чытае выкладчык факультэта, вядомы кінакрытык, знауца беларускага кіно Е. Л. Бондарава. Яна ж арганізуе сустрэчы з кінамастакамі, вядзе гурток рэцэнзентау, наладжвае гарачыя дыскусіі па фільмах. Дапамагае ёй савет СНТ, які узначальвае студэнт IV курса А. Астроускі.

На гэты раз на факультэце была арганізавана сустрэча з доктарам мастацтвазнауства, прафесарам Усесаюзнага дзяржаунага інстытута кінематаграфіі Расціславам Мікалаевічам Юраневым.

Расціслау Мікалаевіч, член журы міжнародных кінафестываляу, расказау студэнтам пра сучаснае становішча кіно у Злучаных Штатах Амерыкі, назвау імёны маладых амерыканскіх рэжысёрау, асвятліу іх творчасць. Доуга не хацелі слухачы адпускаць госця. Падзякай за цікавы расказ былі шчырыя апладысменты і кветкі.

**С. ШЫДЛОУСКАЯ.**

# СНЕЖАНЬСКІ КАЛЯНДАР

4—150 гадоу з дня нараджэння А. Пляшчэева (1825—1893), рускага паэта.

5—Дзень Канстытуцыі СССР.

9—80 гадоу з дня нараджэння (1895) Далорэс Іоарукры (Пасіянарыя), Старшыні Камуністычнай партыі Іспаніі.

18—50 гадоу з дня адкрыцця (1925) XIV з'езда ВКП(б).

21—600 гадоу з дня смерці Джавані Бакачо (1313—1375), італьянскага пісьменніка.

22—70 гадоу з дня пачатку (1905) Снежаньскага узброенага паустання рабочых у Маскве.

22—60 гадоу з дня нараджэння Нікаса Белаяніса (1915—1952), дзеяча грэчаскага рабочага руху.

22—Дзень энергетыка.

24—75 гадоу з дня выхаду (1900) першага нумара агульнарускай нелегальнай марксісцкай газеты «Іскра».

25—1917—абвяшчэнне Савецкай улады на Украіне.

26—150 гадоу з дня паустання (1825) дзекабрыстау на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу.

29—200 гадоу з дня нараджэння К. І. Росі (1775—1849), рускага архітэктара, горадабудауніка.

30—1947—Румынія абвешчана народнай рэспублікай. З 1965 года — Сацыялістычная Рэспубліка Румынія.

30—1922—І Усесаюзны з'езд Саветау прыняу Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

30—100 гадоу з дня нараджэння Х. Пегельмана (1875—1941), эстонскага рэвалюцыйнага дзеяча, публіцыста, паэта.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 07492 Заказ № 1762.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.